**Лукашэнка, В.** Апошняя разведка / В. Лукашэнка // Віцебскі рабочы. – 1974. – 4 крас. – С. 2.

## АПОШНЯЯ РАЗВЕДКА

**З першых дзён акупацыі нашай вобласці нямецка-фашысцкімі захопнікамі на барацьбу з лютым ворагам узняліся партызаны Бацькі Міная. Яны наносілі па гітлераўцах магутныя ўдары. З таго моманту ў рэспубліцы ўсё ярчэй і ярчэй пачало разгарацца полымя ўсенароднай партызанскай барацьбы, гарэла зямля пад нагамі акупантаў. Народныя мсціўцы аказалі доблесным воінам Савецкай Арміі вялікую дапамогу ў разгроме ворага.**

**Сёння спаўняецца трыццаць два гады з дня стварэння 1-й Беларускай партызанскай брыгады пад камандаваннем Міная Піліпавіча Шмырова. Ніжэй друкуем расказ пра адзін з гераічных эпізодаў барацьбы шмыроўцаў з фашысцкімі карнікамі.**

Пяць разведчыкаў атрада М. П. Машкова 1-й Беларускай партызанскай брыгады ішлі на выкананне адказнага задання. Ішлі асцярожна лясной дарогай, якая так добра была вядома Міхаілу. Здаецца, з закрытымі вачыма ён мог бы свабодна па ёй прайсці. Нарэшце, выйшлі з лесу, пачынаўся дробны хмызняк.

Разведчыкі спыніліся, агледзеліся па баках. Быццам усё нармальна. Толькі наперадзе чуўся нудны незмаўкаючы гул фашысцкіх машын, якія рухаліся па шасэ Віцебск – Сураж. Гітлераўцы падцягвалі ўсё новыя і новыя часці да фронту, умацоўвалі трэцюю паласу абароны, так званы «ўсходні вал». Неабходна было пераадолець абаронную паласу фашыстаў на поўдзень ад Суража. Шасэ часта асвятлялася ракетамі, прастрэльвалася трасіруючымі кулямі. Гітлераўцы, якія ператварылі вёскі ўздоўж шасэ ў свае апорныя пункты, выстаўлялі дадатковыя пасты – сакрэтныя засады.

Ноч была цёмная, нізка плылі воблакі, імжэў дробны дожджык, сырой прахаладай цягнула ад раскіслай зямлі. Разведчыкам неабходна было атрымаць дакладныя даныя аб баявой сіле, узбраенні, тэхніцы, воінскіх часцях і гарнізонах ля шасэ.

Міхаіл Купчанка – намеснік камандзіра атрада па разведцы – ішоў крыху сагнуўшыся наперадзе групы. Справа і злева ўступам назад – два разведчыкі. Астатнія ішлі ззаду. Ішлі асцярожна, углядваючыся ў ноч. І калі ўзляцела ракета, усе раптоўна паваліліся, затаілі дыханне, потым уся група асцярожна прасунулася да шасэ.

Мёртвым сном, здаецца, спала вёска Задуброўе. Частка разведчыкаў накіравалася ў напрамку Краўцова – Сураж. Ва ўмоўленым месцы, пасля выканання задання, яны павінны сустрэцца.

Разведка прайшла ўдачна. Заданне камандавання атрада выканана. Зморaныя партызаны ў поўным саставе вярталіся ў лагер дзесьці пад раніцу. Ішлі вельмі асцярожна.

Надышла раніца. Часта дрыжэла наваколле ад артылерыйскага грукату. Гэта былі нашы батарэі, і сотні снарадаў узрываліся дзесьці далёка за правым берагам Заходняй Дзвіны.

Атрад М. П. Машкова размясціўся каля возера Яшкоўскае. Партызаны, змучаныя частымі баямі з перавышаючымі сіламі прыфрантавых фашысцкіх часцей, адпачывалі. Многія байцы прыводзілі ў парадак зброю, некаторыя ціха пелі. Неўзабаве партызанскі дазор далажыў камандзіру атрада аб набліжэнні гітлераўцаў з боку Заходняй Дзвіны. Гэта былі гітлераўцы і ўласаўцы адной з прыфрантавых часцей, кінутыя на барацьбу з партызанамі.

Без доўгіх збораў атрад адразу выступіў па лясной дарозе ў бок вёскі Кошалева. Маняўруючы, ён выйшаў з кальца акружэння.

Але аб гэтым не ведала разведгруппа М. І. Купчанкі. Разведчыкі ўпэўнена ішлі да месца дыслакацыі атрада. І раптам раздаўся выстрал, затым – другі. Гэта насцярожыла байцоў. А раптам фашысты там аказаліся? Усё можа быць. Небяспека падпільноўвала на кожным кроку. Адзіночныя выстралы не спыняліся. Разведчыкі ішлі моўчкі. «Магчыма, Машкоў палюе на качак», – сказаў Міхаіл Купчанка, каб крыху падбадзёрыць таварышаў.

Вось паказалася светлая паласа Яшкоўскага возера. Група спынілася каля самага возера з паўночнага боку і азірнулася кругом. Цішыня. Толькі птушкі спяваюць свае сумныя песні, як бы сумуючы аб мінулым леце. Удалечыні, на ўзвышаным месцы, асабняком стаяў хваёвы бор. Туды і накіраваліся разведчыкі ў пошуках свайго атрада. Наперадзе, як заўсёды, паказваючы прыклад выключнай храбрасці, ішоў Міхаіл Купчанка. Падымаючыся на пясчаную горку, Міхаіл паправіў на плячы аўтамат. І раптам з хваёвага бору разанулі свінцовыя кулі варожых кулямётаў. Адзін з разведчыкаў быў скошан нававал. Ранены Міхаіл Купчанка паваліўся на зямлю і схапіў аўтамат. Астатнія, адстрэльваючыся, падаліся назад. Сыходзячы крывёю, Міхаіл Іванавіч Купчанка біўся да апошняй кулі. У няроўным баі ён загінуў смерцю героя.

Праз некалькі дзён М. Купчанка і яго баявы сябар былі з ушанаваннямі пахаваны на месцы бою каля возера, а ў лістападзе 1943 года іх астанкі перавезлі і пахавалі на могілках ў вёсцы Пенклавічы.

Туды прыходзяць піянеры і школьнікі Ботаніцкай васьмігадовай школы і ўскладаюць вянкі на магілы воінаў і партызан. Мінутай маўчання аддаюць яны даніну глыбокай павагі тым, хто загінуў, абараняючы нашу свяшчэнную зямлю ад фашысцкіх захопнікаў.

**В. ЛУКАШЭНКА,**
**выхавацель інтэрната будтрэста № 9**